**STUDIA WSCHODNIOSŁOWIAŃSKIE** TOM 18, ROK 2018

# SPRAWOZDANIA

DOI 10.15290/sw.2018.18.24

**III Міжнародная летняя школа беларусістыкі,** Мінск, 01–16 ліпеня 2017 г.

З 01 па 16 ліпеня 2017 года у Рэспубліканскім інстытуце вышэйшай школы ў Мінску адбылася III Міжнародная летняя школа беларусістыкі, у якой прынялі ўдзел 44 прадстаўнікі з далёкага і блізкага замежжа (Венгрыя, Германія, ЗША, Іспанія, Кітай, Латвія, Літва, Польшча, Расія, Сербія, Славакія, Украіна, Чэхія, Швецыя, Японія). Сярод навучэнцаў пераважалі навукоўцы, выкладчыкі і студэнты. Функцыю кіраўніка летняй школы выконвала Лідзія Іванаўна Сямешка, а каардынатарамі былі Святлана Макоўчык і Павел Бранавец. Летняя школа прызначаная для ўсіх, хто хоча павышаць сваю кваліфікацыю ў вобласці беларусістыкі.

Сёлетняя Міжнародная летняя школа была прысвечаная 500-годдзю беларускага кнігадрукавання.

У дзень адкрыцця адбыўся вечар знаёмства, на якім з прывітальным словам выступіў рэктар Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы, прафесар Віктар Анатольевіч Гайсёнак, які пажадаў слухачам поспехаў у вывучэнні беларускай мовы. Замежныя ўдзельнікі прадстаўлялі свае краіны, месца вучобы, працы і жыцця з дапамогай прэзентацый, спеваў і страў традыцыйнай кухні.

Праграма школы ўключала двухтыднёвы курс беларускай мовы і лекцыі па гісторыі, літаратуры, мове і культуры беларускага народа. Лекцыі і практычныя заняткі вялі выкладчыкі Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы, Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта, Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта, Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта і навукоўцы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Заняткі па практыцы беларускага маўлення адбываліся ў пяці групах – дзве групы на ўзроўні А0, па адной групе на ўзроўнях А1-А2, В і С. У кожнай групе заняткі вялі вопытныя настаўнікі, напр. у групе А1-А2 гэта былі Павел Бранавец, Ларыса Кныш, Наталля Клішэвіч і стажор Анастасія Іонікава. Выкладчыкамі беларускай мовы ў іншых групах былі Вольга Барысенка, Надзея Шакун, Надзея Старавойтава, Ягор Дзьобік. Для групы ўзроўню С былі арганізаваныя семінары: *Адукацыйны напрамак "Беларуская мова як замежная: сучасны*

*стан і перспектывы развіцця”* (Лідзія І. Сямешка), *Беларускі маўленчы этыкет: гісторыя і сучаснасць* (Надзея П. Старавойтава), *Казачны эпас Уладзіміра Караткевіча* (Святлана А. Сычова), *Сучасная беларуская тэрміналогія: стан і перспектывы развіцця* (Кацярына П. Любецкая), *Дыялог культур як адзін з прынцыпаў арганізацыі навучання: беларуская культурная прастора* (Ганна І. Басава), *Лінгватэсталагічны аналіз перакладаў “Бібліі” на беларускую мову* (Ірына У. Будзько), *Вацлаў Ластоўскі: у пошуках беларускай ідэнтычнасці* (Вольга У. Барысенка), *У сузор’і Янкі Купалы: сучасная інтэрпэтацыя твораў* (Святлана А. Сычова), *Круглы стол “Беларуская сацыякультурная прастора: пагрозы і выклікі ў кантэксце глабалізацыі”* (Любоў М. Уладыкоўская, Дзмітрый У. Караў).

Культурная праграма была скіраваная на тое, каб даць замежным гасцям магчымасць пазнаёміцца з культурай Беларусі. Ужо на трэці дзень удзельнікі маглі прыняць удзел у святочных мерапрыемствах прысвечаных Дню незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Былі арганізаваныя экскурсіі па сталіцы (Мінск – 950-цігадовы і сучасны), наведванне Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі, Нацыянальнай бібліятэкі і музеяў: Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы, Музея старажытнай беларускай культуры НАН Беларусь, Музея Вялікай Айчыннай вайны. Акрамя таго прайшлі самастойныя экскурсіі, напр. ў межах праекта “Вандроўкі ў мінулае” (Зігзагі менскай мінуўшчыны і Маляўнічыя акварэлькі з Лошыцы) ці мерапрыемствы, напр. вячэрняя праграма «Купалле ў Мінску».

Летняя школа арганізавала таксама экскурсіі за межы сталіцы. Удзельнікі наведалі Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту ў вёсцы Азярцо, паехалі на двухдзённую аўтобусную экскурсію у Полацк і Хатынь. Па дарозе пабачылі Бярэзінскі біясферны запаведнік.

У рамках сустрэч з творчымі людзьмі адбыўся майстар-клас па беларускіх спевах з Вольгай Янковіч і фальклорны вечар беларускай паэзіі і спеваў з лідэрам групы “Троіца” Іванам Кірчуком.

Лекцыйная частка складалася з некалькіх тэматычных блокаў:

– культуралогіі: *Францыск Скарына і пачатак еўрапейскай Рэфармацыі* (доктар філасофіі Ірына М. Дубянецкая), *Культура Беларусі ў X–XIII стагоддзях* (дацэнт Сяргей В. Тарасаў); *Беларусы ў Польшчы: культурная і асветніцкая дзейнасць у другой палове XX – пачатку XXI стст.* (дацэнт Валянціна Г. Швайко);

– філасофіі: *Ігнат Канчэўскі: скарбы беларускага мыслення* (дацэнт Павел Баркоўскі);

– гісторыі: *Гісторыя Беларусі ў замках* (пісьменнік, член Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА Анатоль І. Бутэвіч); *Тысячагоддзе беларускай дзяржаўнасці* (дацэнт Сяргей Ф. Шымуковіч);

– фалькларыстыкі: *Беларускі каляндарна-абрадавы фальклор: сучасная інтэрпрэтацыя і формы выканання* (дацэнт Наталля В. Матыліцкая);

– лінгвістычнай праблематыкі: *Беларуская мова ў сучаснай сацыякультурнай прасторы* (член-карэспандэнт НАН Беларусі, прафесар Аляксандр А. Лукашанец), *Актыўныя працэсы ў сістэме функцыянальных стыляў су-*

*часнай беларускай мовы* (дацэнт Кацярына П. Любецкая), *Пераклады Біблії на беларускую мову: ад Францыска Скарыны да сучаснасці* (дацэнт Ірына У. Будзько); *Беларуская тапанімія і антрапанімія: гісторыя і сучасны стан* (дырэктар Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі Ігар Л. Капылоў);

– літаратуры: *Беларуская мастацкая літаратура сёння: сучасныя выданні, хіты шорт-лістоў* (дацэнт Аксана П. Чарнякевіч).

Тэксты некалькіх лекцый, якія былі прачытанная падчас Летняй школы, былі выдадзены ў зборніку.

Замежнымі навучэнцамі апекаваліся валанцёры, у асноўным беларускія студэнты-філолагі, якія дапамагалі ў штодзённым жыцці ў Минску.

На занятках удзельнікі працавалі з дапаможнікамі *Лексічны мінімум па беларускай мове як замежнай. Элементарны ўзровень (А1)* і *Базавы ўзровень (А2)*. У апошнія дні настаўнікі правяралі ўзровень валодання замежнікамі беларускай мовай з дапамогай тэстаў выдадзеных РІВШ.

На закрыцці летняй школы удзельнікі мелі магчымасць прадставіць набытыя за кароткі час навыкі беларускамоўнай камунікацыі ў форме тэатральных выступленняў, прэзентацый, мастацкага чытання самастойна падрыхтаваных вершаў. Пасля завяршэння школы ўдзельнікі атрымалі сертыфікаты.

Праца летняй школы праходзіла ў добразычлівай атмасферы, дазволіла пазнаёміцца з мовай, культурай і ментальнасцю беларускага народа. Для ўсіх удзельнікаў, выкладчыкаў, валанцёраў і арганізатараў час, праведзены ў III Міжнароднай летняй школы беларусістыкі, прынёс карысны досвед і паспрыяў наладжванню кантактаў паміж прыхільнікамі Беларусі.

*Henryk Duszyński-Karabasz*
*Joanna Joachimiak-Prażanowska*
*Uniwersytet Kazimierza Wielkiego, Bydgoszcz*

DOI 10.15290/sw.2018.18.25

## II Międzynarodowa konferencja naukowa *Региональная ономастика: проблемы и перспективы исследования*, Witebsk, 15–16 marca 2018 r.

W dniach 15–16 marca 2018 roku na Wydziale Filologicznym Witebskiego Uniwersytetu Państwowego im. P.M. Maszerowa (Białoruś) odbyła się II Międzynarodowa konferencja naukowa pt. *Regionalna onomastyka: problemy i perspektywy rozwoju* (*Региональная ономастика: проблемы и перспективы исследования*). Organizatorami konferencji były następujące podmioty: Ministerstwo Edukacji Republiki Białoruś, Witebski Uniwersytet Państwowy im. P.M. Maszerowa, Smoleński Uniwersytet Państwowy, Białoruska Fundacja Badań Fundamentalnych oraz Komisja Onomastyczna przy Międzynarodowym Komitecie Slawistów.

W sympozjum wzięło udział kilkudziesięciu badaczy reprezentujących ośrodki naukowe z Białorusi, Rosji, Polski, Ukrainy, Francji, Chin, USA i Kanady.